ПРАВААБАРОНЦЫ
ЗА СВАБОДНЫЯ ВЫБАРЫ

# Выбары дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў 28 склікання

**Кампанія “Праваабаронцы за свабодныя выбары”**

**Аналітычная справаздача**

**ЗМЕСТ**

Высновы

Уводзіны

Умовы назірання

Прававая база

Выбарчыя камісіі

Вылучэнне і рэгістрацыя кандыдатаў

Перадвыбарчая агітацыя

Датэрміновае галасаванне

Галасаванне па месцы знаходжання выбарцаў

Галасаванне на выбарчых участках і падлік галасоў

Скаргі і звароты, звязаныя з выбарамі

Рэкамендацыі

## ВЫСНОВЫ

Выбары дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў 28 склікання, якія пачаліся 14 лістапада 2017 г., праходзілі на фоне пагаршэння агульнай унутрыпалітычнай сітуацыі ў краіне ў параўнанні з папярэднім перыядам “мяккіх практык”, якія распачаліся ў жніўні 2015 г. і скончыліся з пачаткам масавых выступаў грамадзян у лютым 2017 г. Хваля пратэсту грамадзян, выкліканая прымяненнем Дэкрэта № 3, была ўспрынятая ўладамі краіны як сур’ёзная пагроза дэстаблізацыі ўнутрыпалітычнай сітуацыі, што прывяло да пачатку хвалі

рэпрэсій у дачыненні да ўдзельнікаў акцый пратэсту, актывістаў і лідараў апазіцыі, грамадзянскай супольнасці, незалежных журналістаў і праваабаронцаў. Палітычна-матываваны пераслед у той ці іншай форме прымяняўся больш чым да 900 чалавек. У дачыненні да 40 чалавек ужываўся палітычна матываваны крымінальны пераслед.

Нягледзячы на тое, што да канца года сітуацыя ў цэлым стабілізавалася, у месцах пазбаўлення волі па-ранейшаму знаходзіліся палітвязні Міхаіл Жамчужны і Зміцер Паліенка, прызнаны Amnesty International вязнем сумлення. Таксама працягваўся крымінальны пераслед актывістаў незалежнага прафсаюза РЭП Генадзя Фядыніча і Ігара Комліка. У снежні 2017 г. і студзені 2018 г. паводле рашэнняў Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь быў заблакаваны доступ да двух папулярных незалежных інтэрнэт-рэсурсаў "Беларускі партызан" (www.belaruspartisn.org) і "Хартыя-97" (www.charter97.org), працягваўся ціск на незалежных журналістаў, якія супрацоўнічаюць з замежнымі СМІ, не акрэдытаванымі на тэрыторыі Беларусь (найперш тэлеканала Белсат).

Ужо падчас выбарчай кампаніі беларускія ўлады заявілі аб адмове ад распачатага імі ў 2016 г. працэсу далейшага ўдасканалення выбарчага заканадаўства з улікам рэкамендацый БДІПЧ АБСЕ. Такім чынам, у выбарчае заканадаўства не было ўнесена ніякіх зменаў і выбары ў мясцовыя Саветы адбываліся па ранейшых правілах і працэдурах, якія неаднаразова крытыкаваліся ў тым ліку назіральнікамі АБСЕ.

Сама выбарчая кампанія праходзіла вельмі пасіўна і амаль не заўважна для грамадзян. Нягледзячы на фактычную адсутнасць значных парушэнняў і перашкодаў на этапах рэгістрацыі ініцыятыўных груп, збору подпісаў і правядзення передвыбарчай агітацыі, такія этапы выбарчай кампаніі, як датэрміновае галасаванне, падлік галасоў у УВК і ўстанаўленне вынікаў галасавання ў вышэйстаячых камісіях, суараваджаўся шматлікімі маніпуляцыямі, актыўным ужываннем адміністрацыйнага рэсурсу і адсутнасцю транспарэнтнасці.

Назіранне за ўсімі этапамі выбараў яшчэ раз яскрава падкрэсліла ўсе сістэмныя праблемы, існуючыя ў выбарчым працэсе, якія патрабуюць вырашэння.

Выбарчы працэс не адпавядаў шэрагу асноўных міжнародных стандартаў правядзення дэмакратычных і свабодны выбараў. Аб гэтым сведчаць адсутнасць роўнага доступу да сродкаў масавай інфармацыі для ўсіх кандыдатаў, адсутнасць бесстаронніх выбарчых камісій, шматлікія факты прымусу выбарцаў да ўдзелу ў датэрміновым галасаванні, закрытасць шэрагу выбарчых працэдур для назіральнікаў. Найбольш важнай падставай для крытыкі выбараў застаецца адсутнасць празрыстасці падліку галасоў, што не дазваляе лічыць абвешчаныя вынікі выбараў адлюстраваннем волевыяўлення выбарцаў.

## Выбарчыя камісіі

Фарміраванне выбарчых камісій усіх узроўняў па правядзенні выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў адбывалася ў атмасферы большай адкрытасці, чым падчас правядзення апошніх мясцовых выбараў у 2014 г. Усе прадстаўнікі кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары" мелі магчымасць прысутнічаць на пасяджэннях адпаведных органаў улады па фарміраванні выбарчых камісій, аднак у большасці выпадкаў прадстаўнікам кампаніі было адмоўлена ў азнаямленні з дакументамі аб вылучэнні прадстаўнікоў у склад выбарчых камісій, якія паступілі ў мясцовыя выканаўча-распарадчыя органы.

Пры фарміраванні выбарчых камісій, як і на папярэдніх выбарах, адзначаны дыскрымінацыйны падыход да прадстаўнікоў апазіцыйных партый у параўнанні з вылучэнцамі ад праўладных палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў, а таксама працоўных калектываў. Так, у склад ТВК патрапіла толькі 20,6% ад вылучаных

апазіцынымі партымі (0,067% ад усіх сябраў ТВК), у склад АВК – 16,7% ад вылучаных (0,53% ад усіх сябраў АВК), у склад УВК – 11% ад вылучаных (0,04% ад усіх сябраў УВК). У той жа час працэнт "праходнасці" у склад камісій ад праўладных палітычных партый і пяці найбуйнейшых праўладных грамадскіх аб'яднанняў і прафсаюза (БРСМ, ФПБ, Саюз жанчын, Саюз ветэранаў і Белая Русь) традыцыйна складае больш за 90%.

Адсутнасць вызначаных крытэраў пры адборы прэтэндэнтаў у склад выбарчых камісій робіць фактычна бессэнсоўным абскарджанне рашэнняў органаў, якія іх фарміруюць, у судовым парадку.

Прадстаўніцтва палітычных партый у выбарчых камісіях застаецца традыцыйна нізкім, што адлюстроўвае спецыфіку беларускай палітычнай сістэмы. Асноўнымі суб'ектамі выбарчага працэсу (у тым ліку арганізатарамі выбараў) з'яўляюцца праўладныя грамадскія аб'яднанні і працоўныя калектывы.

## Вылучэнне і рэгістрацыя кандыдатаў

Паводле дадзеных ЦВК , зарэгістраваны 17 542 ініцыятыўныя групы, што складае 99,9% ад агульнай колькасці вылучаных.

Статыстыка адмоў у рэгістрацыі і адкліканых заяў аб вылучэнні сведчаць аб выкарыстанні тэхнічных працэдур рэгістрацыі (праверка подпісаў, дэкларацый і г.д.) як інструмента палітычнай барацьбы, працэдуры праверак прымяняліся ВК селектыўна, перш за ўсё супраць апазіцыйных кандыдатаў. Колькасць адмоў у рэгістрацыі кандыдатаў у Мінскі гарадскі Савет склала 23%, у Саветы раённага ўзроўню – 1,5%, у сельскія Саветы – 0,3%.

78% назіральнікаў кампаніі не былі дапушчаны непасрэдна да праверкі дакументаў, пададзеных у камісіі для рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты, і не мелі магчымасці пераканацца ў аб'ектыўнасці камісій пры вывучэнні дакументаў. Па сутнасці, назіральнікі маглі прысутнічаць толькі на пасяджэннях, падчас якіх агучваліся вынікі праверак і выносіліся рашэнні аб рэгістрацыі. Гэта істотна зніжае давер да працы ВК, дазваляе ставіць пад сумнеў не толькі асобныя рашэнні аб адмове ў рэгістрацыі кандыдатаў, але і тыя рашэнні, кандыдаты былі зарэгістраваны.

## Перадвыбарчая агітацыя

У параўнанні з мінулымі выбарамі дэпутатаў мясцовых Саветаў, падчас сёлетніх выбараў выдзелена значна больш месцаў для правядзення масавых мерапрыемстваў з мэтай перадвыбарчай агітацыі, сустрэч з выбарцамі і размяшчэння агітацыйных матэрыялаў. Гэтыя месцы з'яўляюцца больш зручнымі. Пры прыняцці рашэнняў аб месцах агітацыі ўлады часцей кіраваліся прынцыпам "дазволена ўсё, што не забаронена".

Значна больш кандыдатаў у параўнанні з мінулымі выбарамі падалі апавяшчэнні аб правядзенні масавых мерапрыемстваў у спрошчаным парадку. Адпаведна, павялічылася колькасць заяўленых перадвыбарчых пікетаў. Традыцыйна больш актыўна агітацыйныя перадвыбарчыя пікеты заяўлялі ў Мінску: у сярэднім 1 кандыдат заявіў каля 70 масавых мерапрыемстваў.

Выбарчыя камісіі ў рэгіёнах пераважна не інфармавалі грамадскасць аб часе і месцы правядзення сустрэч з выбарчцамі. 30% назіральнікаў кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары" ў рэгіёнах паведамілі, што кандыдаты былі пазбаўленыя роўных умоў,

не маглі сустракацца з выбарцамі ў вылучаных памяшканнях. Як і падчас мінулых выбарчых кампаній, актыўна выкарыстоўваўся адміністрацыйны рэсурс на карысць праўладных кандыдатаў.

Сур’ёзных перашкод для перадвыбарчых пікетаў не адзначана, аднак сустракаліся элементы ціску на пікеты апазіцыйных дзеячоў.

**Датэрміновае галасаванне**

Як і раней, датэрміновае галасаванне насіла арганізаваны характар з удзелам мясцовых органаў улады, адміністрацый прадпрыемстваў і устаноў. У шэрагу выпадкаў ужыванне адмінстратыўных рэсурсаў у мэтах забеспячэння яўкі на выбары суправаджалася элементамі кантролю над выбарцамі (над іх удзелам ці не ўдзелам у выбарах) і пагрозамі прымянення разнастайных дысцыплінарных санкцый для тых, хто не хоча браць удзел у выбарах.

Датэрміновае галасаванне, якое ў Беларусі ўжо традыйцыйна носіць адміністрацыйна-мабілізацыйны характар, застаецца адным з найбольш праблемных этапаў выбарчага працэсу ў Беларусі.

**Галасаванне па месцы знаходжання выбарцаў**

Галасаванне па месцы знаходжання выбарцаў суправаджалася значнымі парушэннямі працэдуры, прадугледжанай арт. 54 ВК. Назіральнікамі кампаніі зафіксаваныя выпадкі, калі выбарцы паведамлялі сябрам УВК, што не звярталіся з просьбамі аб арганізацыі галасавання па месцы свайго знаходжання.

33,3% назіральнкіаў кампаніі зафіксавалі выпадкі, калі выбарцы заяўлялі, што не звярталіся ва УВК с просьбай аб арганізацыі галасавання па месцы свайго знаходжання, калі да іх прыходзілі сябры УВК.

50% назіральнікаў адзначылі несупадзенне колькасці выбарцаў, якія прагаласавалі па месцы знаходжання з колькасцю бюлетэняў, выдадзеных сябрам УВК для арганізацыі такога галасавання.

**Галасаванне на выбарчых участках і падлік галасоў**

У ВК адсутнічае апісанне працэдуры падліку выбарчых бюлетэняў. Рэкамендацыі БДІПЧ АБСЕ і прапановы кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” аб дакладным і падрабязным урэгуляванні дадзенай працэдуры праз пастанову ЦВК пры падрыхтоўцы выбараў не былі улічаны.

Назіральнікі кампаніі адзначаюць, што на пераважнай большасці УВК, на якіх яны ажыццяўлялі назіранне, камісіі ажыццяўлялі сумесны і адначасовы падлік бюлетэняў, не агалошваючы і не дэманструючы ўсім прыстуным кожны выбарчы бюлетэнь. Такая працэдура падліку бюлетэняў не з’яўляецца празрыстай і не дазваляе суаднесці вынікі назірання за падлікам галасоў з дадзенымі, адлюстраванымі ў пратаколе аб выніках галасавання. 97% назіральнікаў кампаніі ацанілі працэдуру падліку галасоў як непразрыстую.

Падчас назірання за працэдурай падліку галасоў назіральнікамі кампаніі былі зафіксаваныя і іншыя парушэнні выбарчага заканадаўства: у 7,1% УВК не праводзілі раздзельнага падліку галасоў, у 42,3% выпадкаў УВК не агалошвалі вынікі раздзельнага падліку галасоў, 53,6% назіральнікаў знаходзіліся на вялікай адлегласці ад сталоў, на якіх ажыццяўляўся падлік галасоў, што не дазваляла весці паўнавартаснае назіраннне за працэдурай.

**Абскарджанне парушэнняў выбарчага заканадаўства**

Падача скаргаў на рашэнні і дзеянні камісій і іншых удзельнікаў выбарчага працэсу традыцыйна не з’яўляецца эфектыўным інтструментам, удзельнікі выбарчага працэсу ў выніку карыстаюцца ім вельмі рэдка.

## УВОДЗІНЫ

Кампанія «Праваабаронцы за свабодныя выбары» – незалежная і палітычна незаангажаваная сумесная ініцыятыва Праваабарончага цэнтра «Вясна» і Рэспубліканскага праваабарончага грамадскага аб’яднання «Беларускі Хельсінкскі камітэт». Мэта кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» – назіранне за выбарамі, ацэнка выбарчага працэсу з пункту гледжання беларускага выбарчага заканадаўства і міжнародных стандартаў свабодных і дэмакратычных выбараў, інфармаванне беларускай грамадскасці і міжнароднай супольнасці аб выніках назірання.

З першага дня выбараў у межах кампаніі дзейнічала 29 доўгатэрміновых назіральнікаў. Назіральнікі былі прадстаўлены ў такой колькасці ТВК і АВК, якая ахоплівае больш за 70% выбарцаў краіны. Вынікі апрацоўкі справаздач па асобных этапах выбараў распаўсюджваліся ў выглядзе адпаведных этапных справаздач.

Падчас датэрміновага галасавання і галасавання ў дзень выбараў назіранне ажыццяўлялі 102 кароткатэрміновых назіральнікаў на 102 выбарчых участках па ўсёй тэрыторыі краіны. Іх справаздачы аб выніках назірання за працэдурамі галасавання выбарцаў і падліку галасоў дазволілі выявіць агульныя тэндэнцыі ў арганізацыі выбарчага працэсу і зафіксаваць узровень парушэнняў ВК.

## УМОВЫ НАЗІРАННЯ

Традыцыйна на назіранне за правядзеннем мясцовых выбараў не запрашаліся міжнародныя місіі БДІПЧ АБСЕ і Назіральнай місіі Парламенцкай Асамблеі СНД. Міжнароднае назіранне ажыццяўлялі прадстаўнікі некаторых дыпламатычных місій у Рэспубліцы Беларусь.

Акрамя кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» нацыянальнае назіранне рабіла кампанія «Права выбару – 2018», якая аб’яднала восем палітычных суб’ектаў і з’яўляецца назіраннем з боку апазіцыйных палітычных партый і рухаў.

Таксама назіранне ажыццяўлялася і некаторымі праўладнымі грамадскімі аб’яднаннямі і палітычнымі партыямі (Белая Русь, БРСМ, Беларускі саюз жанчын, Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі і інш.), якія вылучылі назіральнікаў. Аднак інфармацыі аб выніках гэтага назірання і выпрацаваных рэкамендацыях па далейшым удасканаленні выбарчага працэсу няма.

Назіральнікі кампаніі “Правабаронцы за свабодныя выбары” у цэлым не сутыкаліся з сур’ёзнымі перашкодамі і супрацьдзеяннем сваёй прафесійнай дзейнасці. Аднак традыцыйна недаступнымі для атрымання інфармацыі назіральнікамі засталіся такія этапы выбарчага працэсу, як фарміраванне выбарчых камісій (адсутнасць доступу да азнаямлення з дакументамі аб вылучэнні прадстаўнікоў у слад ВК), рэгістрацыя кандыдатаў (назіранне за працэдурамі праверкі подпісаў выбарцаў і азнаямленне з іншымі дакументамі па рэгістрацыі кандыдатаў). Як і раней нетранспарэнтнай для назіральнікаў застаецца працэдура падліку галасоў, а таксама працэдуры падвядзення вынікаў галасавання ў вышэйстаячых акруговых і тэрытарыяльных выбарчых камісіях.

## ПРАВАВАЯ БАЗА

Прававую базу выбарчай сістэмы краіны складаюць Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь і іншыя заканадаўчыя акты, а таксама Пастановы Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў.

Пасля папярэдніх мясцовых выбараў 2014 года Выбарчы кодэкс быў зменены: апошняя са змен, унесеная Законам Рэспублікі Беларусь № 268-З ад 4 чэрвеня 2015 г., канкрэтызуе і пашырае сферу забароны замежнага фінансавання выбарчага працэсу. Пад пагрозай прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці забаронена агітацыя за байкот выбараў. Замацаваны падставы, на якіх можа быць адмоўлена ў рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты. Мясцовыя выбары праходзяць у адзін тур. Перамагае той кандыдат, які набраў большасць галасоў грамадзян, што ўзялі ўдзел у галасаванні (калі балатуецца толькі адзін кандыдат, ён перамагае ў выпадку, калі атрымае не менш за палову галасоў выбарцаў). Няма мінімальнай колькасці выбарцаў, павінных узяць удзел у галасаванні для таго, каб выбары былі прызнаны сапраўднымі.

Паводле Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы, ратыфікаванага Законам Рэспублікі Беларусь ад 24 снежня 1999 г. "Аб ратыфікацыі Дагавора аб стварэнні Саюзнай Дзяржавы" № 4 2/118, і згодна з арт. 58 ВК, грамадзяне Расійскай Федэрацыі, якія стала пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, маюць права ў парадку, прадугледжаным ВК, удзельнічаць у выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў.

Некаторыя ранейшыя спрэчныя пытанні, якія на папярэдніх мясцовых выбарах перашкаджалі назіраць за фарміраваннем камісій, былі вырашаны адпаведнай пастановай ЦВК. Таксама пастанова ЦВК №36 зацвердзіла парадак фарміравання выбарчых камісій.

Пастановай ЦВК ад 15 лістапада 2017 г. № 39 быў зацверджаны парадак інфармавання грамадзян аб рабоце па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў ў мясцовыя Саветы дэпутатаў.

Як і падчас папярэдніх парламенцкіх і прэзідэнцкіх выбараў, Цэнтральная камісія захавала практыку выбарачнай публікацыі сваіх пастаноў, што не адпавядае прынцыпу галоснасці выбараў. На дзень выбараў не было апублікавана не менш за шэсць пастаноў ЦВК.

Варта адзначыць, што самы адчувальны момант выбарчай кампаніі, які заўжды выклікаў асаблівую крытыку назіральнікаў, а менавіта парадак падліку галасоў, як і раней, застаўся не патлумачаным ні ў метадычных дапаможніках, ні ў пастановах ЦВК. Нязменнасць парадку падліку галасоў з кампаніі ў кампанію паказвае незацікаўленасць ЦВК у арганізацыі празрыстага падліку.

<u>Намаганні праваабаронцаў</u> па ўдасканаленні выбарчага заканадаўства згодна рэкамендацый БДІПЧ АБСЕ былі праігнараваныя ўладамі.

## ВЫБАРЧЫЯ КАМІСІІ

У адпаведнасці з арт. 29 і 34 ВК падрыхтоўку і правядзенне выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў забяспечваюць АВК, ТВК, якія ажыццяўляюць у раёнах г. Мінска паўнамоцтвы АВК па выбарах дэпутатаў у Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў (у кожным раёне г. Мінска ствараецца па адной камісіі) і УВК. Згодна з арт. 34 ВК АВК па выбарах дэпутатаў абласных Саветаў дэпутатаў, ТВК, якія ажыццяўляюць у раёнах г. Мінска паўнамоцтвы акруговых выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў у Мінскі гарадскі Савет

дэпутатаў фарміруюцца прэзідыумамі абласных, Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў і абласнымі, Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтамі з прадстаўнікоў палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, а таксама прадстаўнікоў грамадзян, вылучаных у склад камісіі шляхам падачы заявы. АВК фарміруюцца ў складзе 9–13 сяброў не пазней за 75 дзён да выбараў. УВК фарміруюцца ў складзе 5–19 чалавек раённымі, гарадскімі выканаўчымі камітэтамі, а ў гарадах з раённым дзяленнем – мясцовымі адміністрацыямі

Парадак вылучэння прадстаўнікоў у склад камісій рэгулюецца арт. 35 ВК.

Выбарчыя камісіі з'яўляюцца адным з ключавых механізмаў выбарчага працэсу пры правядзенні мясцовых выбараў, ад працы якіх залежыць, ці будуць выбары мясцовых Саветаў адпавядаць стандартам свабодных і дэмакратычных выбараў.

Сур'ёзных перашкодаў у прыёме дакументаў аб вылучэнні ў склад выбарчых камісій з боку прадстаўнікоў органаў, якія фарміравалі камісіі, назіральнікамі кампаніі зафіксавана не было.

Амаль усе прадстаўнікі кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары" мелі магчымасць прысутнічаць на пасяджэннях органаў, якія ўтваралі камісіі. Гэта стала станоўчым вынікам урэгулявання дадзенай праблемы Пастановай Цэнтральнай камісіі № 36 ад 15.11.2017 г. Для параўнання: падчас мясцовых выбараў 2014 г. у 43–52% выпадкаў (у залежнасці ад узроўню камісіі) прадстаўнікоў кампаніі не дапускалі на пасяджэнні органаў, якія ўтваралі камісіі.

Прадстаўнікам кампаніі ў большасці выпадкаў было адмоўлена ў азнаямленні з матэрыяламі аб вылучэнні ў камісіі, а ў тых выпадках, дзе гэта было дазволена зрабіць, звычайна азнаямленне ажыццяўлялася "з рук" прадстаўнікоў органаў, якія фарміравалі камісіі. Пры такіх абставінах прадстаўнікам кампаніі было цяжка паўнавартасна ацаніць правільнасць афармлення дакументаў аб вылучэнні прадстаўнікоў у склад камісій, зацверджаных у якасці сяброў камісій.

Прычыны, па якіх назіральнікам адмаўлялі ў азнаямленні, былі розныя. Напрыклад, дакументы аб фарміраванні Віцебскай абласной ТВК не паказалі таму, што нібыта "гэта не прадугледжана законам"; Аршанскай раённай – "у гэтым няма неабходнасці, аб усім можна даведацца на сайце", Мінскай гарадской – без тлумачэння прычын, Мазырскай раённай – "дакументы знаходзяцца ў іншым памяшканні", Глыбоцкай раённай – "гэта дакументы для ўнутранага карыстання", Баранавіцкай раённай – "не маем права". У Салігорску просьба назіральніка была пастаўлена на галасаванне і ў азнаямленні з дакументамі адмоўлена. Прадстаўнікі Мінгарвыканкама ў якасці прычыны адмовы ў азнаямленні з дакументамі па вылучэнні сяброў АВК назвалі тое, што "дакументы, якія паступілі ў дзяржаўны орган, з моманту іх паступлення лічацца дакументамі дзяржаўнага органа і не падлягаюць распаўсюджанню".

Правядзенне саміх пасяджэнняў у большасці выпадкаў насіла фармальны характар і праходзіла без абмеркавання асабістых і дзелавых якасцяў кандыдатаў, вылучаных у склад камісій. Працягласць пасяджэнняў органаў, якія ўтвараюць камісіі, у многіх месцах была мінімальнай. Напрыклад, Магілёўская раённая ТВК была створана за 8 хвілін, Баранавіцкая раённая і гарадская ТВК – за 9 хвілін кожная.

Абмеркавання кандыдатур не адбывалася на 42,9 % пасяджэнняў. Пры ўтварэнні Барысаўскай раеннай ТВК і Магілёўскай гарадской ТВК асабістыя якасці прэтэндэнтаў абмяркоўваліся, аднак галасаванне ішло па загадзя складзеным праекце рашэння, асноўным

крытэрыем служыла наяўнасць досведу працы ў выбарчых камісіях. Апазіцыйным прадстаўнікам адмаўлялі ва ўключэнні ў склад камісіі па розных падставах: “працавала раней у АВК, актыўнасці не выяўляла”, “парушаў заканадаўства”, “няма досведу”.

Падчас назірання за працэсам фарміравання АВК на пасяджэнні прэзідыўмаў Брэсцкага аблвыканкама і Брэсцкага аблсавета выявілася, што ў працэсе адбору сябраў АВК улічваліся рэкамендацыі “працоўных груп”. Месцы працы вылучаных кандыдатаў не агучваліся. У Віцебску старшыня пасяджэння абвяшчаў “характарыстыкі” кожнай камісіі, а не канкрэтных вылучэнцаў. Характарыстыкі ўключалі такія фармулёўкі, як, напрыклад, “вылучаныя ўсе годныя грамадзяне, якія здольны паспяхова выконваць пастаўленыя задачы”. Галасаванне па ўсіх вылучаных было адзінагалосным.

У большасці выпадкаў галасаванне за ўключэнне ва УВК адбывался па загадзя сфарміраваным спісе без папярэдняга абмеркавання дзелавых і асабістых якасцяў прэтэндэнтаў. У выпадках, калі колькасць прэтэндэнтаў перавышала колькасць сябраў УВК, як правіла, рабілася персанальнае галасаванне, але ў большасці выпадкаў без абмеркавання кожнай кандыдатуры. Асноўным крытэрыем, якім кіраваліся прадстаўнікі выканкамаў і адміністрацый, была наяўнасць папярэдняга досведу працы ў выбарчых камісіях. Трэба адзначыць, што большасць УВК была сфарміраваная на безальтэрнатыўнай аснове.

У склад 1 309 ТВК было абрана 10 499 чалавек, альбо 94% ад вылучаных.



У склад 361 АВК было абрана 4 104 чалавек, альбо 92,2% ад вылучаных.




Ва ўтвораныя 5 870 УВК (на 300 менш, чым на папярэдніх мясцовых выбарах) увайшло 63 816 чалавек – 97% вылучаных.




Актыўнасць палітычных партый была невысокая, але з вылучаных 161 ў склад ТВК увайшлі ў склад ТВК толькі 125 іх прадстаўнікоў, з вылучаных 423 ў склад АВК увайшлі ў склад АВК толькі 293 іх прадстаўніка; з 3 932 сябраў партый у склад УВК увайшлі 3 569 прадстаунікоў. Большасць з тых, каго ўключылі ў выбарчыя камісіі, склалі сябры партый, лаяльных да дзеючай улады.

Ад найбуйнейшых праўладных грамадскіх аб’яднанняў – Белая Русь, БРСМ, Беларускі саюз жанчын, Беларускае грамадскае аб’яднанне ветэранаў і ФПБ ў склад ТВК уключана 97,3 % ад вылучаных, у склад АВК уключана 1 871 прадстаўнік – 95,5 % ад вылучаных, ў склад УВК патрапілі 97% вылучаных.

Прадстаўнікі апазіцыйных партый прысутнічаюць толькі ў 7 ТВК з 1309, у 22 АВК з 361; у 5 870 УВК яны атрымалі 26 месцаў. Такое невялікае прадстаўніцтва не залежыць ад актыўнасці палітыкаў: суадносіны колькасці прадстаўнікоў апазіцыйных партый, вылучаных у склад камісій і колькасці прадстаўнікоў апазіцыйных партый, уключаных у склад камісій, значна адрозніваюца ад вынікаў у іншых прэтэндэнтаў:


КОЛЬКАСЦЬ ПРАДСТАЎНІКОЎ У СКЛАДЗЕ ТВК АД ВЫЛУЧАНЫХ СУБ'ЕКТАМІ
97,80%
92,90%
20,60%
94%
Ад 4-х ГА і ФПБ
Ад праўладных партый
Ад апазіцыйных партый
У сярэднім


КОЛЬКАСЦЬ ПРАДСТАЎНІКОЎ У СКЛАДЗЕ АВК АД ВЫЛУЧАНЫХ СУБ'ЕКТАМІ
95,50%
92,50%
16,70%
92%
Ад 4-х ГА і ФПБ
Ад праўладных партый
Ад апазіцыйных партый
У сярэднім


КОЛЬКАСЦЬ ПРАДСТАЎНІКОЎ У СКЛАДЗЕ УВК АД ВЫЛУЧАНЫХ СУБ'ЕКТАМІ
97,00%
95,90%
11,00%
96%
Ад 4-х ГА і ФПБ
Ад праўладных партый
Ад апазіцыйных партый
У сярэднім

Прадузятае стаўленне органаў па ўтварэнні выбарчых камісій да прадстаўнікоў апазіцыйных палітычных партый з’яўляецца відавочным.

11 сябраў пасялковых і сельскіх ТВК, 2 сябра АВК, 8 сябраў УВК – гэта грамадзяне Расійскай Федэрацыі. Жанчын ва УВК – 72,58% ад агульнага складу. У абласных ТВК іх толькі 41%. Дзяржаўных служачых ва УВК – 3%, у АВК іх 12,4%, а ў абласных ТВК – 15,4%.

## ВЫЛУЧЭННЕ І РЭГІСТРАЦЫЯ КАНДЫДАТАЎ

У адпаведнасці з арт. 60 ВК права вылучаць кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў належыць палітычным партыям, працоўным калектывам і грамадзянам шляхам збору подпісаў. Збор подпісаў выбарцаў можа ажыццяўляцца ў форме пікетавання. Дазвол на правядзенне пікетавання не патрабуецца, калі яно праводзіцца ў месцах, не забароненых мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі.

Удзел адміністрацый арганізацый у зборы подпісаў, таксама як прымус у працэсе збору подпісаў і ўзнагарода выбарцаў за ўнясенне подпісаў, не дапускаецца. Прэтэндэнты на статус кандыдата ў дэпутаты не маюць права прыцягваць асобаў, якія знаходзяцца ў іх падпарадкаванні, для ажыццяўлення ў працоўны час дзейнасці, што спрыяе вылучэнню. Парушэнне гэтых патрабаванняў можа стаць падставай для адмовы ў рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты. Падпісныя лісты здаюцца ў адпаведную АВК для праверкі дакладнасці подпісаў выбарцаў і рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты.

Не ўрэгуляванай у ВК з’яўляецца магчымасць назіральнкаў прысутнічаць падчас праверкі сапраўднасці подпісаў і ншых дакументаў, падазеных дзеля рэгістрацыі. Улічваючы тое, што адной з падставаў адмовы ў рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты з’яўляецца недакладнасць сабраных за вылучэнне подпісаў і іншых дакументаў, назіранне за адпаведнасцю працэдуры іх праверкі патрабаванням ВК з’яўляецца вельмі актуальным.

Працэдуру праверкі подпісаў АВК рэгламентуе ў арт. 67 ВК. Праверцы падлягаюць не ўсе падпісныя лісты. Калі колькасць несапраўдных подпісаў дасягае пэўнага працэнта, падлік спыняецца і кандыдату адмаўляюць у рэгістрацыі.

Рэгістрацыя ініцыятыўных груп і выдача сябрам ініцыятыўных груп пасведчанняў і падпісных лістоў адбылася своечасова. ЦВК паведамляе, што 17 542 ініцыятыўныя групы прайшлі рэгістрацыю. Толькі 16 ініцыятыўным групам было адмоўлена ў рэгістрацыі, 7 заяваў былі адкліканыя і 1 заява не разглядалася. Варта адзначыць, што ўсе ініцыятыўныя групы па вылучэнні сябраў палітычных партый былі зарэгістраваныя, адмовы ў рэгістрацыі выносіліся толькі ў адносінах да беспартыйных вылучэнцаў. У параўнанні з папярэднімі выбарамі колькасць адмоваў у рэгістрацыі ініцыятыўных груп зменшылася больш чым у 2 разы. Такім чынам, у агульнай колькасці зарэгістраваных ініцыятыўных груп 2,6% складаюць ініцыятыўныя групы па вылучэнні партыйных кандыдатаў.

Практычна ўсе назіральнікі адзначаюць “працэс лібералізацыі ў дачыненні да збору подпісаў”. Так, у Гомелі ў параўнанні з выбарамі 2014 і 2016 гг. сітуацыя змянілася ў лепшы бок: колькасць месцаў, забароненых для збору подпісаў, істотна скарацілася, але сёлета дадалася цэнтральная плошча горада. Палепшылася сітуацыя ў Маладзечна: фактычна забароненымі для збору подпісаў засталіся толькі пасадачныя платформы БЧ і прыпынкі грамадскага транспарту. У Магілёве істотна паменела забароненых месцаў. Аналагічныя звесткі паступілі з іншых рэгіёнаў. 100% назіральнікаў кампаніі “Праваабаронцы за

свабодныя выбары" паведамілі, што на этапе збору подпісаў ні адной з ініцыятыўных груп не чыніліся перашкоды з боку ўлады.

Факты выкарыстання адміністратыўнага рэсурсу па-ранейшаму фіксуюцца. У Оршы подпісы за кандыдата па Заслонаўскай выбарчай акрузе №24, дырэктара Аршанскага каледжа філіяла УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту" А.М. Казлову збіралі яе падначаленыя ў працоўны час. У навучэнцаў коледжа ў інтэрнаце подпісы збірала загадчыца інтэрната.

Працэдуры праверкі подпісаў і іншых дакументаў, пададзеных на рэгістрацыю, засталіся па-ранейшаму непразрыстымі. Дапушчана ў камісіі было 22% назіральнікаў. На пытанне, ці адбывалася праверка звестак аб кандыдатах, пададзеных у анкетах і дэкларацыях аб даходах і маемасці галосна і публічна ў прысутнасці назіральнікаў, 85% назіральнікаў адказалі адмоўна.

У той жа час ёсць асобныя пазітыўныя вынікі ўзаемадзеяння назіральнікаў з камісісямі. 16 студзеня ў Гомелі Леаніду Судаленку дазволілі прысутнічаць на пасяджэнні працоўнай групы Гомельскага гарадскога выбаркама пры праверцы подпісаў выбарцаў і дакументаў асоб, якія вылучаюцца кандыдатамі ў дэпутаты ў Гомельскі гарадскі Савет дэпутатаў. Назіральнік Раман Юргель з Гродна паведаміў, што яму дазволілі напярэдадні пасяджэння азнаёміцца з сабранымі подпісамі і дакументамі трох прэтэндэнтаў у кандыдаты ў дэпутаты па Вішнявецкай выбарчай акрузе №11. Фармальна не адмовілі назіральніку Віктару Адзіночанку ў Пушкінскай акруговай камісіі №18 г. Гомеля. Аднак ажыццявіць гэта ў поўнай меры было складана з-за няпоўнага ўказання часу.

Прычыны адмоў у рэгістрацыі агучваліся камісіямі. Так, Магілёўская гарадская выбарчая камісія не зарэгістравала 12 кандыдатаў у дэпутаты (сярод якіх вылучэнец ад дзяржструктураў – дырэктар прадстаўніцтва Белдзяржстраху па г. Магілёву). Паведамлена, што ў іх дакументах была недакладная інфармацыя пра сплочаныя падаткі, адзначана вылучэнне не ад той арганізацыі, не ўказана непагашаная судзімасць. Сярод нязгодных з рашэннем Магілёўскай гарадской выбарчай камісіі – першы намеснік БСДП (Грамада) Ігар Барысаў. З яго словаў, з шэрагам подпісаў ўзніклі праблемы з-за няправільнага апісання межаў акругі, у якую былі ўключаныя лішнія дамы.

Большасць вылучэнцаў у кандыдаты і іх ініцыятыўныя групы, адзначаюць назіральнікі, не праяўлялі актыўнасці ў працэсе праверкі дакументаў на рэгістрацыю, часта нават не прысутнічалі на пасяджэннях камісій па рэгістрацыі. Ацаніць характар праверкі дакументаў па рэгістрацыі кандыдатаў у камісіях немагчыма, бо назіральнікі практычна не ўдзельнічалі ў гэтым працэсе.

Паводле дадзеных ЦВК, зарэгістраваны 22 278 кандыдатаў[1], што складае 98,1% ад колькасці вылучаных. Зарэгістраваны 16 229 кандыдатаў, вылучаных грамадзянамі шляхам збору подпісаў, што складае 72,85% ад агульнай колькасці зарэгістраваных, 6 546 кандыдатаў, вылучаных працоўнымі калектывамі (29,38%), 871 кандыдат, вылучаны палітычнымі партыямі (3,91%).

---

[1] Яшчэ 10 кандыдатаў былі зарэгістраваны па выніках разгляду скаргаў: 9 – вышэйстаячымі камісіямі, 1 – судом: http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/Elections-MS28-elect_52-53.pdf
На дзень выбараў, паводле дадзеных ЦВК, засталося 22.031 кандыдаты, паколькі ў адносінах да 7 былі адмененыя рашэнні аб рэгістрацыі, 251 – знялі сваю кандыдатуру: http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/Elections-MS28-elect_52-53.pdf.




Працэнт рэгістрацыі кандыдататаў ад праўладных палітычных партый вышэйшы за адпаведную лічбу апазіцыйных партый. Так, 4 апазіцыйныя партыі вылучалі 219 кандыдатаў, з якіх 174 былі зарэгістраваныя, што складае 79,5% ад агульнай колькасці вылучаных апазіцыйнымі партыямі (у мінулыя выбары гэта лічба склала каля 75%). У той жа час сярэдні працэнт рэгістрацыі кандыдатаў ад праўладных партый вышэйшы. Кандыдатаў ад Камуністычнай партыі Беларусі зарэгістравана 95%, ад Рэспубліканскай партыі труда і справядлівасці – 92,8%.

Праявілася розніца ў падыходах да прадстаўнікоў апазіцыі, якія вылучаліся шляхам збору подпісаў. Калі агульны працэнт рэгістрацыі кандыдатамі ў дэпутаты шляхам збору подпісаў склаў 98% (такая ж лічба ў 2014 г.), то ў прадстаўнікоў «Руху за свабоду» – 28,6%, у вылучэнцаў незарэгістраванай партыі БХД – 33%, у вылучэнцаў кампаніі «Гавары праўду» – 60,9%.

На 57 акруг Мінскага гарадскога Савета ў ліку ўсіх зарэгістраванах кандыдатаў ад партый прайшло 130 асоб, а на 3 767 акруг ў раённых Саветах 238 кандыдатаў ад партый, на 13 225 акруг сельскіх Саветаў – толькі 123 кандыдаты ад партый. Статыстыка адмоў у рэгістрацыі і адкліканых заяў аб вылучэнні дазваляе ўбачыць не толькі ўзровень палітычнага накалу, але і ўзровень выкарыстання тэхнічных працэдур рэгістрацыі (праверка подпісаў, дэкларацый і г.д.) у палітычнай барацьбе. Так, колькасць адмоў у рэгістрацыі кандыдатаў у Мінскі гарсавет склала 23%, у Саветы раённага ўзроўню – 1,5%, у сельскія Саветы – 0,3%. Розніца ў якасці пададзеных на рэгістрацыю дакументаў не можа быць патлумачана ўзроўнем падрыхтоўкі кандыдатаў у дэпутаты Саветаў ніжэйшага ўзроўню ў параўнанні з вопытнымі ў палітычных баталіях сталічнымі партыйцамі і актывістамі. Эксперты кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» лічаць, што па-ранейшаму пры разглядзе дакументаў і рэгістрацыі кандыдатаў ВК селектыўна выкарыстоўвалі тэхнічныя працэдуры.

## ПЕРАДВЫБАРЧАЯ АГІТАЦЫЯ

Прававой асновай правядзення перадвыбарнай агітацыі з’яўляюцца арт. 45-47 ВК.

ВК прадастаўляе грамадзянам, палітычным партыям, грамадскім аб’яднанням, працоўным калектывам, давераным асобам кандыдатаў у дэпутаты, а таксама ініцыятыўным групам права свабоднага і ўсебаковага абмеркавання перадвыбарчых праграм кандыдатаў у дэпутаты, іх палітычных і асабістых якасцяў, права на правядзенне агітацыі за ці супраць кандыдата падчас сходаў, мітынгаў, у СМІ, а таксама падчас сустрэч з выбарцамі.

Мясцовыя органы ўлады па ўзгадненні з адпаведнымі выбарчымі камісіямі вызначаюць памяшканні для правядзення сустрэч з кандыдатамі і перадвыбарчых сходаў, якія арганізуюцца выбарцамі. Кандыдаты маюць права за кошт сродкаў уласнага выбарчага фонда арэндаваць будынкі і памяшканні для правядзення сустрэч з выбацамі. Мясцовыя органы ўлады па ўзгадненні з адпаведнымі камісіямі таксама выдзяляюць на тэрыторыі ўчасткаў для галасавання месцы, найбольш наведвальныя грамадзянамі, для размяшчэння агітацыйных друкаваных матэрыялаў. Размяшчэнне агітацыйных друкаваных матэрыялаў у іншых месцах ажыццяўляецца з дазволу кіраўніка адпаведнай арганізацыі. Артыкул 45.1 ВК прадугледжвае правядзенне перадвыбарчых агітацыйных масавых мерапрыемстваў кандыдатамі і іх давеpанымі асобамі ў спрошчаным парадаку. ВК прадугледжвае, што кандыдаты ў дэпутаты, палітычныя партыі, іншыя грамадскія аб’яднанні, працоўныя калектывы, грамадзяне, якія вылучылі кандыдатаў, з моманту рэгістрацыі кандыдатаў карыстаюцца дзяржаўнымі сродкамі масавай інфармацыі на роўных правах. Інфармацыйныя матэрыялы пра кандыдатаў, якія распаўсюджваюцца ў сродках масавай інфармацыі, павінны быць аб’ектыўнымі і дакладнымі. У іх не павінна аддавацца перавага асобным кандыдатам.

Парадак выкарыстання дзяржаўных СМІ кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых Саветаў у дэпутаты 28 склікання рэгламентаваны пастановай ЦВК ад 12 снежня 2017 г. № 46. Паводле пастановы, эфірны час для выступаў па радыё кандыдатаў у дэпутаты прадастаўляецца па працоўных днях у перыяд з 22 студзеня па 12 лютага 2018 г. Пачатак трансляцыі выступаў – у 18.00. На выступ аднаго кандыдата ў дэпутаты павінна быць адведзена не менш за тры хвіліны. Чарговасць выступаў кандыдатаў вызначае лёсаванне. Перадвыбарчыя выступы кандыдатаў у дэпутаты ідуць у запісе.

Сродкі бюджэта выкарыстоўваюцца выбарчымі камісіямі на выраб агульных плакатаў з біяграфічнымі дадзенымі і інфармацыйнымі матэрыяламі аб кандыдатах у дэпутаты для накіравання іх выбарцам. Участковая камісія па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў накіроўвае выбарцам інфармацыю пра кандыдатаў у дэпутаты, пададзеную акруговай, тэрытарыяльнай выбарчай камісіяй.

Кандыдаты ў дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў маюць магчымасть самастойна (за кошт уласнага выбарчага фонда) арэндаваць памяшканні для сустрэч з выбарцамі (ч. 8 арт. 45 ВК) і выpабляць агітацыйнаю прадукцыю.

Перадвыбарчая агітацыя працягвалася з дня рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў па 17 лютага 2018 г. уключна.

Сёлетняя агітацыйная кампанія праходзіла менш актыўна ў параўнанні з мінулымі выбарамі ў мясцовыя Саветы дэпутатаў, нягледзячы на больш спрыяльныя ўмовы для яе правядзення. Так, у параўнанні з мінулымі выбарамі дэпутатаў мясцовых Саветаў, падчас сёлетніх выбараў было выдзелена значна больш месцаў для правядзення масавых мерапрыемстваў з мэтай перадвыбарчай агітацыі. Пры гэтым выдзеленыя месцы з’яўляюцца больш зручнымі, чым падчас папярэдніх кампаній. Многія выканкамы пры прыняцці рашэння аб месцах для правядзення масавых мерапрыемстваў з мэтай перадвыбарчай агітацыі кіраваліся прынцыпам “дазволена ўсё, што не забаронена”. Тое самае датычыцца памяшканняў для

сустрэч з выбарцамі і месцаў для агітацыйных матэрыялаў. Напрыклад, у Магілёве, Пінску і іншых гарадах ў пералік прадпрыемстваў, дзе можна размяшчаць агітацыйныя плакаты кандыдатаў, дададзены прадпрыемствы сувязі, звычайна шматлюдныя.

Толькі 35% назіральнікаў у рэгіёнах адказалі станоўча на пытанне ці друкаваліся ў мясцовых дзяржаўных і недзяржаўных СМІ праграмы кандыдатаў. У большасці дзяржаўных СМІ практычна няма інфармацыі пра кандыдатаў ад апазіцыі, не публікуюцца іх праграмы. Назіральнікі кажуць пра адсутнасць партыйных улётак ці іншых альтэрнатыўных матэрыялаў.

Напрыклад, “Гродзенская праўда” ў асноўным давала артыкулы пра кандыдатаў ад улады (дзеючых дэпутатаў, чыноўнікаў ці дырэктараў прадпрыемстваў) у форме інтэрв'ю ці прамых ліній. На сайце “Гродзенскай праўды” такіх матэрыялаў налічваецца больш за трыццаць. Сацыяльная актыўнасць і грамадзянская пазіцыя апазіцыйных кандыдатаў на старонках газеты не асвятляецца. Аналагічная сітуацыя ў баранавіцкай газеце “Наш край”, наваполацкай “Новай газеце”, “Весніку Магілёва” і іншых выданнях.

Дзяржаўная раённая газета “Астравецкая праўда” адмовілася апублікаваць перадвыбарчую праграму кандыдата ў дэпутаты Мікалая Уласевіча. У адказ на ліст Уласевіча рэдактар выдання Ніна Рыбік без належнай аргументацыі сцвярджае, што праграма Мікалая Уласевіча нібыта парушае патрабаванні ВК.

У параўнанні з мінулымі выбарамі значна больш кандыдатаў падалі апавяшчэнні аб правядзенні масавых мерапрыемстваў у спрошчаным парадку: у 2014 г. толькі 332 кандыдаты скарысталіся магчымасцю падачы апавяшчэння, ці 1,4% ад агульнай колькасці кандыдатаў. Было заяўлена аб правядзенні 9064 масавых мерапрыемстваў. У 2018 г. (па стане на 12 лютага) такія апавяшчэнні падаў ужо 4951 кандадат, ці 22% ад агульнай колькасці кандыдатаў. Падчас сёлетняй кампаніі кандыдаты заявілі аб правядзенні 27340 перадвыбарчых пікетаў.






У сярэднім па краіне 1 кандыдат у дэпататы мясцовых Саветаў заявіў аб правядзенні 1,2 мерапрыемстваў (на мінулых выбарах – 0,4). Традыцыйна больш актыўна агітацыйныя перадвыбарчыя пікеты заяўлялі ў Мінску: у сярэднім 1 кандыдат заявіў каля 70 масавых мерапрыемстваў.

На пытанне, ці маглі ўсе кандыдаты на роўных умовах праводзіць сустрэчы з выбарцамі ў вылучаных памяшканнях, 30% назіральнікаў кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” паведамілі, што кандыдаты былі пазбаўленыя роўных умоў. Выбарчыя камісіі ў рэгіёнах пераважна не інфармавалі грамадскасць аб часе і месцы правядзення сустрэч з выбарцамі.

Агітацыйная кампанія праўладных кандыдатаў вялася пераважна ў форме сустрэч з выбарцамі ў актавых залах прадпрыемстваў. Удзел у такіх сустрэчах выбарцаў-супрацоўнікаў забяспечваўся адміністрацыяй. Акрамя таго, назіральнікі кампаніі з Гродна, Баранавіч і іншых гарадоў паведамляюць, што практыка выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу прымянялася ў навучальных установах. “У школах класныя кіраўнікі збіраюць бацькоў (з пашпартамі) на сустрэчы з кандыдатамі. Гэта адбываецца ўвечары. Бацькі адразу ж галасуюць датэрмінова. Сустрэчы ў школах ладзілі і кандыдаты ад дэмакратычных партый, напрыклад ад АГП. Аднак яўка на іх была нязначная”. Факты прымусу працаўнікоў да ўдзелу ў агітацыйных мерапрыемствах адзначаны назіральнікамі ў гарадах Мінск, Брэст, Орша, Глыбокае і іншае.

У 92% акруг, дзе назіранне ажыццяўлялі актывісты кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары”, кандыдатам не адмаўлялі ў правядзенні сустрэч з выбарцамі. Сустракаліся асобныя выпадкі перашкод. Так, у Оршы сарвалі сустрэчу кандыдата ў дэпутаты Аршанскага райсавета дэпутатаў па Цэнтральнай выбарчай акрузе № 1 Аляксандра Булаўкі.

Для правядзення перадвыбарчых пікетаў не стваралася сур’ёзных перашкод. Аднак сустракаліся элементы ціску на пікеты апазіцыйных дзеячоў. Напрыклад, у Віцебску на пікетах апазіцыйных кандыдатаў абавязкова прысутнічалі супрацоўнікі спецслужбаў, якія вялі непрыхаваную відэафіксацыю. Гэта прыводзіла да таго, што гараджане не наважваліся падыходзіць і ўдзельнічаць у абмеркаванні праграм кандыдатаў. 8 лютага ў Светлагорску

пікет кандыдата ў дэпутаты Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў па Маладзёжнай выбарчай акрузе № 57 Юрыя Ляшэнкі таксама фіксавалі супрацоўнікі спецслужбаў.

Назіральнікі кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары" заўважылі факты рэдакцыі ці адвольнага змянення зместу агітацыйных матэрыялаў кандыдатаў ад апазіцыі. "У Слоніме на некалькіх участках ёсць альтэрнатыўныя кандыдаты – сябры Слонімскага згуртавання дэмакратычных сіл. Але ўжо пасля друкавання ўлётак яны ўбачылі, што з тэкставых матэрыялаў выкрасленыя цікавыя факты з іх біяграфій".

З падачы выбарчых камісій гарадская газета "Віцьбічы" распаўсюдзіла непраўдзівыя звесткі аб наяўнасці ў Вадзіма Кузьміна, кандыдата ад партыі левых "Справядлівы свет" па Смаленскай выбарчай акрузе №7 г. Віцебска, судзімасці. Вадзім Кузьмін звярнуўся ў гарадскую пракуратуру. Скажонымі апынуліся факты ва ўлётках кандыдата ў дэпутаты па Шклоўскай гарадской выбарчай акрузе № 54 Рыгора Кастусёва. Не ўказана істотная частка яго біяграфічных звестак, у прыватнасці, дадзеныя пра тое, што кандыдат з'яўляецца старшынёй Партыі БНФ. Першамайская раённая выбарчая камісія вырабіла інфармацыйныя матэрыялы кандытата па Карбышаўскай выбарчай акрузе №50 г. Мінска Аляксея Сігаева, не ўзгадніўшы з ім факты, важныя на думку прэтэндэнта на дэпутацкі мандат. У Астравецкім раёне падаў скаргі на падобныя дзеянні Варнянскай сельскай выбарчай камісіі кандыдат Мікалай Уласевіч.

У параўнанні з мінулымі выбарамі дэпутатаў мясцовых Саветаў, падчас сёлетняй выбарчай кампаніі кандыдаты ў дэпутаты больш актыўна выкарыстоўвывалі магчамасць стварэння выбарчага фонда для фінансавання выдаткаў па передвыбарчай агітацыі. Па стане на 8 лютага 2018 г. з 22 289 зарэгістраваных кандыдатаў выбарчыя фонды стварылі 2 328, ці 10,4% ад агульнай колькасці кандыдатаў. Пры гэтым толькі 1 692 кандыдаты (7,6%) выкарысталі цалкам ці часткова сродкі выбарчых фондаў. Для параўнання, падчас мінулых выбараў толькі 3,8% кандыдатаў стварылі свае выбарчыя фонды і толькі 3,5% кандыдатаў – цалкам ці часткова выкарысталі сродкі фондаў.

Кандыдаты не праяўлялі вялікай зацікаўленасці да стварэння ўласных выбарчых фондаў, хаця фармальна любыя выдаткі на передвыбарчую агітацыю могуць быць выкарастаныя толькі са сродкаў выбарчага фонду.

## ДАТЭРМІНОВАЕ ГАЛАСАВАННЕ

Датэрміновае галасаванне пачалося 13 лютага 2018 года.

Згодна арт. 53 ВК, выбарца, які не можа ў дзень выбараў быць па месцы свайго жыхарства, мае права не раней, чым за пяць дзён да выбараў, прыйсці ў памяшканне для галасавання і прагаласаваць. Афіцыйнага пацверджання прычын немагчымасці грамадзяніна прыйсці ў памяшканне для галасавання ў дзень выбараў не патрабуецца.

Датэрміновае галасаванне не праводзіцца на ўчастках для галасавання ўтвораных у санаторыях, прафілакторыях, дамах адпачынку, шпіталях і іншых арганізацыях аховы здароўя, якія аказваюць медыцынскую дапамогу ў стацыянарных умовах. Грамадзяне, якія адбываюць пакаранне ў выглядзе арышту, на гаўптвахтах вайсковых камендатур, адміністратыўны арышт, адміністратыўна затрыманыя болей чым на тры гадзіны, затрыманыя ў парадку прадугледжаным КВК і КПК, а таксама ў парадку арт. 10 Закона Рэспублікі Беларусь ад 4.01.2010 г. "Аб парадку і ўмовах накіравання грамадзян у ЛТП і

ўмовах знаходжання ў іх”, згодна з п. 1 Пастановы Цэнтральнай камісіі № 3 ад 16.01.2018 г. галасаюць у парадку прадугледжаным арт. 54 ВК – па месцы іх знаходжання (адпаведна толькі ў асноўны дзень галасавання). Згодна ў п. 7 дадзенай пастановы грамадзяне, якія знаходзяцца ў ЛТП, адбываюць пакаранне ў папраўчых установах адкрытага тыпу ўключаюцца ў спісы выбарцаў на ўчастках для галасавання, на тэрыторыі якіх знаходзяцца дадзеныя ўстановы.

Датэрміновае галасаванне адбываецца ў прысутнасці не менш двух сяброў УВК з 10 да 14 і з 16 да 19 гадзін. Кожны дзень у 14 і 19 гадзін пасля заканчэння галасавання старшыня камісіі ці ягоны намеснік заклейвае шчыліну ў выбарчай скрынцы для галасавання аркушам паперы і распісваецца на ім. Ускрыццё шчыліны адбываецца штодня, адпаведна ў 16 і 10 гадзін, старшынём камісіі ці ягоным намеснікам, пры гэтым мае права прысутнічаць назіральнік.

Спісы выбарцаў, бюлетэні для галасавання ў перыяды з 19 да 10 гадзіна і з 14 да 16 гадзінаў павінны захоўвацца у сэйфах альбо металічных шафах. Сэйф (металічная шафа) штодня па заканчэнні часу датэрміновага галасавання ў 19 гадзін апячатваецца старшынём (ягоным намеснікам). Захоўванне скрыні для галасавання, дакументаў па выбарам забяспечваецца старшынём УВК. У перыяд датэрміновага галасавання штодня старшыня ці намеснік старшыні УВК складае пратакол, у якім указваюцца колькасць бюлетэняў, атрыманых УВК, колькасць грамадзян, якія атрымалі выбарчыя бюлетэні (у апошні дзень датэрміновага галасавання агульную колькасць, арымаўшых бюлетэні), колькасць пашкоджаных бюлетэняў і колькасць не выкарыстаных бюлетэняў. Пратакол падпісваецца старшынёй ці намеснікам старшыні УВК і вывешваецца для ўсеагульнага азнаямлення ў памяшканні для галасавання.

Як і раней, датэрміновае галасаванне насіла характар арганізаванага мясцовымі органамі улады, адміністрацыямі прадпрыемстваў і установаў мерапрыемства. У шэрагу выпадкаў ужыванне адмінстратыўных рэсурсаў у мэтах забеспячэння яўкі на выбары суправаджалася элементамі кантролю над выбарцамі і пагрозамі прымянення дысцыплінарных санкцый для тых, хто не хоча браць удзел у выбарах.

Як і ў папярэдніх выбарчых кампаніях, асноўнымі ўдзельнікамі сёлетняга датэрміновага галасавання былі студэнты ВНУ і навучэнцы іншых навучальных установаў, жыхары працоўных інтэрнатаў, працаўнікі дзяржаўных прадпрыемстваў і ўстановаў. Для арганізацыі ўдзелу ў датэрміновым галасаванні іншагародніх студэнтаў і навучэнцаў, як і раней, адміністрацыі ВНУ давалі адгулы, выкарыстоўвалі сацыяльныя сеткі.

Старшныя ЦВК Лідзія Ярмошына лічыць цалкам прымальным метады “стымуляцыі”, якія ўжываюць бюджэтныя арганізацыі і навучальныя ўстановы. Пры гэтым варта адзначыць, што на выбарах у мясцовыя саветы дэпутатаў няма парога яўкі для прызання выбараў не адбыўшыміся.

Грамадскі рэзананс атрымаў выпадак на механіка-матэматычным факультэце БДУ, калі намеснік дэкана Валеры Курсаў аказваў ціск на студэнтаў. У інтэрвью сайту “Наша ніва” В. Курсаў не адмаўляў, што прасіў студэнтаў “выканаць свой грамадзянскі доўг”.

Паказальная яўка на датэрміновым галасаванні ў інтэрнатах БДУ. Так, на выбарчым участку № 35 у Маскоўскім раёне сталіцы яна склала 96,4%.

Кіраўніцтва звода “Нафтан” пагражала сваім працаўнікам выстаўленнем прагула ў выпадку, калі яны не прагаласуюць. Варта нагадаць, што генеральны дырэктар ААТ

“Нафтан” Аляксандр Дзямідаў балатуецца ў Віцебскі абласны Савет дэпутатаў па адной з пяці выбарчых акругаў горада –Маладзёжнай № 40.

На некаторых УВК назіральнікамі кампаніі былі зафіксаваныя факты несупадзення дадзеных аб прыняўшых удзел у галасаванні выбарцаў па падліках назіральнікаў, з дадзенымі, адлюстраванымі ў пратаколах УВК. Розніца ў бок іх завышэння назіралася ў пратаколах УВК. Пра шматразовае завышэнне яўкі выбарцаў заяўлялі назіральнікі кампаніі “Права выбару” і некаторыя кандыдаты ў дэпутаты.

Так, кандыдадат у дэпутаты Мінгарсавета па Акадэмічнай выбарчай акрузе № 48 у Першамайскім раёне г. Мінска Юры Губарэвіч быў вымушаны выклікаць міліцыю на УВК № 11. У першы дзень датэрміновага галасавання на гэтым участку назіральнікі зафіксавалі 60 выбарчшыкаў, а ў пратаколе УВК іх значылася 145. Акрэдытаваныя назіральнікі сам кандыдат запатрабавалі правесці праверку. Аднак праверкі праведзена не было, а ў адказе на скаргу ў ЦВК было ўказана, што назіральнікі не маюць права весці візуальны падлік колькасці прыняўшых удзел у галасаванні, паколькі гэтае права не замацаванае ў пераліку правоў назіральніка ў арт. 13 ВК.

Вялікая колькасць выбарцаў, што прынялі ўдзел у датэрміновым галасаванні (34, 95%), сведчыць аб тым, што гэты від галасавання ў Беларусі, які паводле выбарчага заканадаўства з’яўляецца выключэннем, на практыцы стаў насіць ардынарны характар. Для прыкладу яўка на датэрміновым галасаванні на мясцовых выбарах 2014 г. склала 32,04 %.

Асобна варта адзначыць факты шматразовага галасавання выбарцаў на выбарчых участках, хаця яны і не насілі масавага характару. Асаблівы рэзананс атрымаў выпадак галасавання выбарцы, зарэгістраванага ў пасёлку Нарач Мінскай вобалсці, на двух выбарчых участках у г. Мінску. Галасаванне адбывался па пашпарце, ў якім на старонцы са штампап аб рэгістрацыі дадзены грамадзян паставіў код з лічбаў, які ў соцсетках напярэдадні быў указаны ў ананімным паведамленні адной з настаўніц школы Мінска. Старшыя ЦВК Л. Ярмошына ў інтэрвью дзяржаўнаму інфармацыйнаму агенству БЕЛТА назвала гэтую інфармацыю “правакацыяй”.

Яшчэ 15 лютага, за некалькі дзён да вышэйапісанага выпадку, на скрыню кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” прыйшло ананімнае паведамленне: “Працую ў адной са сталічных школ і сутыкнуўся вось з чым. Адміністрацыя школы паставіла алоўкам нейкую пазнаку ў пашпарце і папрасіла з’явіцца на чатыры выбарчыя ўчасткі ў акрузе і прагаласаваць за пажаданага кандыдата замест незнаёмых мне людзей”. Паведамляе чалавек, які з пэўных меркаванняў не хацеў сябе называць. “Справа арганізаваная так: я прыходзіў на выбарчы ўчастак, паказваў камісіі свой пашпарт. Штампа прапіскі, які адносіў бы мяне да гэтага ўчастку, зразумела, няма. Камісія заўважала пазнаку і давала мне распісацца ў спісе аб атрыманні бюлетэня насупраць імя выбарцы, якое, зразумела, не супадала з маім і было мне незнаёмае. Я ставіў дату і подпіс — усюды свой, – атрымліваў бюлетэнь, галасаваў і апускаў яго ў скрыню. І так на чатырох участках. Разам са мной ўчасткі абыходзілі і іншыя супрацоўнікі школы”. Малады чалавек такім чынам прагаласаваў на выбарчых участках, размешчаных у сярэдніх школах №185 і №201, а таксама ў гімназіях №4 і №39 г. Мінска.

Назіральніца Валянціна Свяцкая на ўчастку №28 Трактаразаводскай выбарчай акругі №57 Мінска звярнула ўвагу на некалькі мужчын, у якіх пазнала тых, хто прыходзіў галасаваць днём раней. Назіральніца рашуча запатрабавала, каб яны пакінулі памяшканне для галасавання. Адзін з іх сыйшоў, так і не атрымаўшы ў другі раз бюлютэнь для галасавання.

Старшыня АГП Анатоль Лябедзька ў другі дзень датэрміновага галасавання заўважыў на адным з участкаў Цэнтральнага раёна г. Мінска групу з сямі жанчын, якіх арганізавана прывезлі мікрааўтобусам да гімназіі № 34. Пабачыўшы, што Лябедзька здымае відэа на тэлефон, жанчыны пачалі адварочвацца ад камеры і разыходзіцца.

На ўчастку №71 па Машэраўскай выбарчай акрузе Мінска, што змяшчаецца ў гімназіі №23, назіральнік пабачыў арганізаваную групу з 10 асобаў, якія прыехалі на адной машыне. Групамі па 2-3 чалавекі яны заходзілі на ўчастак і галасавалі. Астатнія чакалі на вуліцы.

Эксперты кампаніі "Правабаронцы за свабодныя выбары" адзначаюць, што такі від фальсіфікацый, як шмаразовае галасаванне выбарцаў, фактычна не фіксаваўся ў ранейшыя выбарчыя кампаніі і з'яўляецца даволі рэдкім відам фальсіфікацый для Беларусі. З'яўленне інфармацыі ад назіральнікаў кампаніі і публікацыі ў СМІ аб выяўленні падобных фактаў выклікаюць занепакоенасць і патрабуюць праверкі праваахоўнымі органамі.

## ГАЛАСАВАННЕ ПА МЕСЦЫ ЗНАХОДЖАННЯ ВЫБАРЦАЎ

У адпаведнасці з арт. 54 ВК участковая выбарчая камісія абавязаная забяспечыць магчымасць удзельнічаць у галасаванні выбарцам, якія па стане здароўя ці па іншых паважных прычынах не змогуць прыйсці ў дзень выбараў у памяшканне для галасавання. У гэтых мэтах ва УВК павінна быць не больш за тры пераносныя скрыні для галасавання.

УВК па просьбе выбарцаў, выказанай у пісьмовай ці вуснай форме, даручае не менш чым двум сябрам камісіі арганізаваць галасаванне па месцы знаходжання гэтых асоб у дзень выбараў. Выбарцы маюць права вусна ці пісьмова звярнуцца ў адпаведнную УВК з заявай аб арганізацыі галасавання па месцы іх знаходжання ў любы час пасля ўтварэння УВК, а ў дзень выбараў не пазней за 18.00. Ніякага афіцыйнага пацверджання прычын немагчымасці прыйсці ў памяшканне для галасавання не патрабуецца.

На падставе зваротаў сябры УВК атрымліваюць бюлетэні і распісваюцца ў іх атрыманні. Колькасць бюлетэняў павінна супадаць з колькасцю паступіўшых просьб выбарцаў.

Для арганізацыі дадзенага віда старшыні УВК ці ягоны намеснік з асноўнага спісу выбарцаў, выпісвае ў асобны ўкладны ліст усе дадзеныя аб гэтых асобах і падпісвае яго. У гэтым укладным лісце выбарцы пры атрыманні бюлетэня ўласнаручна распісваюцца. Затым у асноўным спісе выбарцаў робіцца адзнака, што гэтыя асобы прагаласавалі па месцы свайго знаходжання. Укладныя лісты з подпісамі выбарцаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні па месцы свайго знаходжання, павінны захоўвацца разам з асноўным спісам.

Пры арганізацыі галасавання па месцы знаходжання выбарцаў мае права прысутнічаць назіральнік.

Дадзеная працэдура галасавання традыцыйна падвяргаецца крытыцы з боку нацыянальных і міжнародных назіральніка найперш з-за таго, штот арт. 54 ВК прадугледжвае магчымасць вусных зваротаў грамадзян аб арганізацыі галасавання па месцы свайго знаходжання, у тым ліку непасрэдна ў дзень галасавання. Гэта робіць магчымым правадзенне гэтага віда галасавання з парушэннямі ўстаноўленых працэдур і сварае цяжкасці з назіраннем за такім галасаваннем.

18 снежня назіральнікамі кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары" былі зафіксаваныя выпадкі парушэння працэдур галасавання па месцы знаходжання выбарцаў.

Так, назіральніца кампаніі выбарчым участку № 26 ў г. Светлагорску Алена Маслюкова сутыкнулася з тым, што з 11-ці чалавек, пазначаных ва ўкладным лісце, ніхто не звяртаўся з просьбай аб галасаванні.

18 лютага ў Гродна назіральнік кампаніі, які ездзіў з сябрамі ўчастковай камісіі УВК №12 Ленінскага раёна на галасаванне па месцы знаходжання выбарцаў, выявіў факты, што ў спісах для галасавання былі людзі, якія ўвогуле не падавалі заяўкі. Так, у доме па вул. Даватара, 7 людзі заяўлялі, што не прасілі да іх прыходзіць і адмаўляліся галававаць увогуле. Падобнае адбывалася і падчас выязнога галасавання ад УВК №15 і УВК №19 Ленінскага раёна.

18 лютага ў Оршы зафіксавана некалькі аналагічных выпадкаў. Напрыклад, на выбарчым участку №16 у СШ №5. Назіральніку дазволілі паехаць на галасаванне на даму з адной з брыгадаў. Са 100 бюлетэняў, якія выдалі сябрам камісіі, удалося запоўніць толькі 14, таму што людзі або не адчынялі дзверы, або адмаўляліся галасаваць. Другая брыгада, якая атрымала 200 бюлетэняў і паехала без назіральнікаў, праз тры гадзіны вярнулася з поўнай скрыняй. Другі раз назіральніка на выбарчым участку №16 на галасаванне на даму не пусцілі, а каля 14:00 увогуле выдалілі з участка. Прычынай гэтага былі названы яго "кепскія паводзіны", з чым сам назіральнік не згодны.

На ўчастку №8, дзе назіраў Яўген Анішчанка, даверaная асоба кандыдата ад АГП Алены Кучынскай, адзначаны факты несупадзення дадзеных. Па стане на 13:55 на ўчастак, па падліках назіральніка, прыйшло 130 выбарцаў, а ў спісах для галасавання на даму ўжо было запісана 265.

33,3 % назіральнікаў кампаніі адзначылі, што імі фіксаваліся выпадкі, калі выбарцы заяўлялі, што не звярталіся ва УВК с просьбай аб арганізацыі галасавання па месцы свайго знаходжання.

50 % назіральнікаў адзначылі несупадзенне колькасці грамадзян, якія прагаласавалі па месцы свайго знаходжання, з колькасцю бюлетэняў, выдадзеных сябрам УВК для арганізацыі такога галасавання.

## ГАЛАСАВАННЕ НА ВЫБАРЧЫХ УЧАСТКАХ І ПАДЛІК ГАЛАСОЎ

Асноўным прынцыпам правядзення падліку бюлетэняў з'яўляецца ажыццяўленне раздельнага падліку галасоў: спачатку ажыццяўляецца падлік бюлетэняў у скрынях для датэрміновага галасавання, потым у скрынях для галасавання па месцы знаходжання выбарцаў, а потым у скрынях для галасавання ў дзень выбараў.

Вынікі раздельнага падліку галасоў агалошваюцца, але ў пратаколе аб выніках галасавання ўказваецца сумарны вынік падліку. Копія пратакола аб выніках галасавання вывешваецца для ўсеагульнага азнаямлення, назіральнік мае права сваімі сіламі і сродкамі вырабіць ягоную копію. Дадзеная копія не завяраецца пячаткай і подпісамі сябраў УВК. Варта адзначыць, што непасрэдна сам метад падліку бюлетэняў у выбарчым заканадаўстве не прапісаны. Гэта акалічнасць з'яўляецца асноўнай сістэмнай праблемай беларускага выбарчага заканадаўства і робіць магчымым правядзенне нетранспарэнтнай для назіральнікаў працэдуры падліку галасоў.

Гэта, як і раней, з'яўляецца асноўнай падставай для крытыкі выбараў у Беларусі з боку нацыянальных і міжнародных назіральнікаў, а рэкамендацыі зробленыя БДІПЧ АБСЕ па

выніках назірання за выбарамі, утрымліваюць прапановы заканадаўчага ўрэгулявання працэдуры падліку.

Галасаванне ў асноўны дзень выбараў 18 лютага пачалося ў 08.00 і скончылася ў 20.00. Значных парушэнняў выбарчага заканадаўства падчас галасавання зафіксавана не было. Аднак былі зафіксаваны выпадкі выдалення назіральнікаў з участкаў для галасавання ў сувязі з ажыццяўленнем імі фота- і відэа здымкі. Трэба адзначыць, што арт. 13 ВК не ўтрымлівае забароны ажыццяўлення фота-відэа здымкі назіральнікамі, таму выдаленні назіральнікаў па такіх матывах эксперты кампаніі “Праваабронцы за свабодныя выбары” лічаць незаконнымі, яны парушаюць прынцып галоснасці пры правядзенні выбараў.

У Метадычным даведніку для УВК, зацверджаным ЦВК, прадугледжана, што назіральнікі, якія прысутнічаюць пры падліку галасоў, займаюць месцы, якія дазваляюць ім назіраць за дзеяннямі сябраў камісій. Але ў большасці выпадкаў назіральнікі знаходзіліся ў месцах, вызначаных старшынямі УВК, адтуль немагчыма было якасна назіраць за працэдуармі падліку галасоў. Пра гэта паведамілі 57% назіральнікаў.

Не выконваліся УВК рэкамендацыі ЦВК па размяшчэнні сябраў камісіі вакол стала, на якім вядзецца падлік галасоў такім чынам, каб адзін бок стала заставаўся свабодным для агляду. У большасці выпдакаў сябры камісій размяшчаліся вакол стала і засланялі сваімі целамі сталы, на якіх вёўся падлік.



## СКАРГІ І ЗВАРОТЫ, ЗВЯЗАНЫЯ З ВЫБАРАМІ

Паводле інфармацыі ЦВК, з 16 выпадкаў адмовы ў рэгістрацыі ініцыятыўных груп, толькі ў 1 выпадку была пададзена скарга. Рашэннем вышэйстаячай камісіі ў яе задавальненні было адмоўлена.

Паводле інфармацыі ЦВК, на этапе рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты з 311 асобаў, якім было адмоўлена ў рэгістрацыі кандыдатамі ў дэпутаты, 75 чалавек падалі скаргі (ці 24%). З іх: 9 скаргаў былі задаволеныя (ці 12%), што крыху больш, чым на мінулых выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў – 6,3%. Яшчэ 11 скаргаў пасля разгляду вышэйстаячымі выбарчымі камісіямі былі накіраваны ў суды. З іх толькі 1 была задаволена судом, ці 11% з агульнай колькасці разгледжаных (на мінулых выбарах было задаволена 3 з 30 скаргаў, ці 0,1%).

Паводле інфармацыі ЦВК, на рашэнні мясцовых органаў улады аб фарміраванні выбарчых камісій было пададзена 15 скаргаў, з іх на рашэнні аб фарміраванні тэрытарыяльных ВК – 5 скаргаў, на рашэнні аб фарміраванні акруговых ВК – 1, на рашэнні аб фарміраванні УВК – 9. Як і падчас мінулых выбараў, ніводная скарга не была задаволена.

Як неаднаразова падкрэслівалася экспертамі кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары”, адсутнасць вызначаных крытэраў пры адборы прэтэндэнтаў у склад выбарчых камісій робіць фактычна бессэнсоўным абскарджанне ў судовым парадку рашэнняў органаў, якія іх фарміруюць.

## РЭКАМЕНДАЦЫІ

Змены ВК апошніх гадоў не ўлічваюць большасці рэкамендацый АБСЕ і Венецыянскай камісіі, вынесеных па выніках назірання за папярэднімі выбарамі, а таксама прапановы кампаніі «Праваабронцы за свабодныя выбары». Большасць рэкамендацый не страцілі сваю актуальнасць. Выбары паказалі, што без дэталёвай рэгламентацыі парадку фарміравання ВК, галасавання і падліку галасоў немагчыма забяспечыць адпаведнасць працэдур міжнародным стандартам у галіне свабодных і справядлівых выбараў, у прыватнасці, Капенгагенскаму дакументу АБСЕ 1990 г.

Выбарчая кампанія таксама засведчыла неабходнасць забеспячэння рэальнай роўнасці кандыдатаў у сферы доступу да сродкаў масавай інфармацыі і пашырэння правоў назіральнікаў. Змены ў выбарчым заканадаўстве, прапанаваныя ніжэй, дазволяць наблізіць выбары да міжнародных стандартаў, а таксама павялічыць давер да вынікаў выбараў як з боку грамадзян Беларусі, так і з боку міжнароднай супольнасці.

### Выбарчыя камісіі

У ВК неабходна закласці норму, якая б давала гарантыі прысутнасці ў выбарчых камісіях прадстаўнікоў палітычных партый і забяспечвала плюралістычны склад камісій. Неабходна забяспечыць, каб палітычныя партыі, якія прынялі ўдзел у выбарчай кампаніі, у тым ліку парламенцкай, мелі права дэлегаваць аднаго прадстаўніка ў кожную з тэрытарыяльных, акруговых і ўчастковых выбарчых камісій. І толькі ў выпадку, калі палітычная партыя не скарысталася такім правам, мясцовыя распарадчыя і выканаўчыя органы атрымаюць права самастойна запаўняць вакантныя месцы ў выбарчых камісіях. Аналагічным чынам, першачарговае права вылучаць сваіх прадстаўнікоў у выбарчыя камісіі павінны мець

кандыдаты ў дэпутаты. Акрамя таго, трэба заканадаўча вызначыць крытэры для кандыдатаў у склад выбарчых камісій (дэлегаванне палітычнай партыяй, адукацыя, іншыя прафесійныя веды), якія б ускладнілі іх адвольнае прызначэнне і маглі б ацэньвацца судом пры разглядзе адпаведных скаргаў.

**Рэгістрацыя кандыдатаў**

Неабходна выключыць магчымасць выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу пры зборы подпісаў, у прыватнасці, забараніць збор подпісаў не сябрамі ініцыятыўных груп. Акрамя таго, трэба прадугледзець права назіральнікаў прысутнічаць пры праверцы подпісаў за вылучэнне кандыдатаў.

**Спісы выбарцаў**

Для павелічэння празрыстасці і падсправаздачнасці працэсу рэгістрацыі выбарцаў неабходна стварыць адзіны рэестр усіх выбарцаў Рэспублікі Беларусь. Грамадзянам і назіральнікам (у тым ліку davераным асобам, прадстаўнікам СМІ і міжнародным назіральнікам) павінен быць дадзены поўны доступ да спісаў. Кожны грамадзянін павінен мець права знаёміцца са спісамі выбарцаў да пачатку галасавання. Акрамя таго, назіральнікі павінны мець магчымасць знаёміцца з гэтымі спісамі падчас галасавання. Колькасць выбарцаў, зарэгістраваных на ўчастку для галасавання, павінна абвяшчацца выбарчымі камісіямі як напярэдадні галасавання, так і пасля яго заканчэння.

**Фінансаванне выбараў**

Трэба на заканадаўчым узроўні вярнуць дзяржаўнае фінансаванне выдаткаў кандыдатаў па вырабу друкаванай агітацыйнай прадукцыі. Варта прадугледзець магчымасць адкрыцця спецыяльных фондаў з моманту рэгістрацыі ініцыятыўных груп па вылучэні кандыдатаў у дэпутаты для аплаты выдаткаў па зборы подпісаў за іх вылучэнне, па аналогіі з прэзідэнцкімі выбарамі.

**Перадвыбарчая агітацыя**

Заканадаўства прадугледжвае працягласць перыяду перадвыбарчай агітацыі не больш за 1 месяц. Такі тэрмін агітацыі не толькі абмяжоўвае магчымасці агітацыі для кандыдатаў, але і ўскладняе атрыманне грамадзянамі поўнай інфармацыі аб кандыдатах і іх праграмах. Прапаноўваецца павялічыць тэрмін агітацыйнай кампаніі. Акрамя таго, неабходна пазбавіць суб’ектаў, якія размяшчаюць палітычную рэкламу, адказнасці за змест рэкламы, якую прадаставілі кандыдаты ці палітычныя партыі.

**Судовае абскарджанне рашэнняў, звязаных з выбарамі**

ВК прадугледжвае абмежаваны пералік падстаў для звароту ў суд. Неабходна прадугледзець магчымасць судовага абскарджання любых рашэнняў выбарчых камісій і іншых дзяржаўных органаў у пытаннях, датычных выбараў. Найперш неабходна забяспечыць магчымасць судовага абскарджання пастаноў камісій, якія зацвярджаюць вынікі выбараў.

**Датэрміновае галасаванне**

Працэдура датэрміновага галасаваня ў яе сённяшнім выглядзе дазваляе ажыццяўляць розныя маніпуляцыі падчас падліку галасоў. У сувязі з гэтым прапаноўваецца разгледзець магчымасць поўнай адмены датэрміновага галасавання.

У выпадку, калі датэрміновае галасаванне не будзе адменена, прапаноўваецца ўвесці крытэры, адпаведнасць якім дае выбарцу права на датэрміновае галасаванне. Такімі крытэрамі павінны быць падставы, якія адназначна сведчаць аб немагчымасці для выбарцы ўзяць удзел у галасаванні ў дзень выбараў, напрыклад, ад'езд за мяжу ці іншыя дакументальна пацверджаныя доказы.

Трэба таксама заканадаўча дэталізаваць працэдуры захавання выбарчых скрыняў падчас датэрміновага галасавання, апячатвання памяшканняў, у якіх знаходзіцца выбарчая скрыня. Неабходна забараніць знаходжанне пабочных асобаў, у тым ліку супрацоўнікаў міліцыі, у памяшканнях для галасавання і пакоях, у якіх захоўваюцца выбарчыя скрыні, бюлетэні і іншыя матэрыялы па выбарах. Таксама неабходна прадугледзець права назіральнікаў знаходзіцца ў памяшканнях для галасавання па-за часам працы выбарчых камісій (перапынак на абед, перыяд пасля заканчэння галасавання) у выпадках, калі там застаюцца сябры выбарчых камісій.

Варта забяспечыць усе УВК празрыстымі цэльнымі выбарчымі скрынямі з пластыкавымі стужкамі для апячатвання з індывідуальным нумарам выбарчага ўчастка і арганізаваць відэаназіранне на працягу ўсіх дзён датэрміновага галасавання ў анлайн рэжыме. Таксама трэба забяспечыць усе УВК індывідуальнымі пячаткамі з асобнымі нумарамі кожнай УВК, забяспечыць абароненасць выбарчых бюлетэняў адпаведнымі знакамі.

**Галасаванне па месцы знаходжання выбарцаў**

Трэба вызначыць, што правам на галасаванне па месцы знаходжання карыстаюца выбарцы са значнымі пашкоджаннямі здароўя, якія перашкаджаюць яму самастойна з'явіцца на ўчастак для галасавання, што пацвярджаецца дакументам медычнай установы. Трэба замацаваць у ВК, што права на такое галасаванне ўзнікае ў грамадзяніна толькі пасля перадачы ў УВК да дня галасавання пісьмовай заявы аб немагчымасці галасавання на выбарчым участку.

**Падлік галасоў**

Існуючая працэдура падліку галасоў не з'яўляецца празрыстай. Адна з асноўных прычын – адсутнасць дэталізацыі працэдуры падліку галасоў у ВК. У сувязі з гэтым трэба заканадаўча замацаваць наступныя прынцыпы працэдуры падліку галасоў: падлік галасоў праводзіцца галосна ў прысутнасці назіральнікаў, якія могуць сачыць за правільнасцю падліку волевыяўлення выбарцаў у кожным бюлетэні (г.зн. бачыць змест кожнага бюлетэня); падлік галасоў праводзіцца адным з сяброў камісіі, які агучвае і дэманструе ўсім сябрам камісіі і назіральнікам кожны бюлетэнь; падлік галасоў ажыццяўляецца асобна па кожнай скрыні для галасавання, а выніці такога асобнага падліку галасоў асобна па кожнай скрыні адлюстроўваюцца ў выніковым пратаколе. Копія выніковага пратаколу, завераная старшынёй і сакратаром камісіі і замацаваная пячаткай, выдаецца назіральніку па яго просьбе.

Таксама прапануецца заканадаўча замацаваць права зарэгістраваных у АВК і ТВК назіральнікаў і давераных асоб кандытатаў непасрэдна прысутнічаць і назіраць за працэдурамі перадачы выбарчых бюлетэняў і пратаколаў з вынікамі галасавання з участкаў для галасавання ў ТВК. Прадугледзець магчымасць размяшчэння на сайце ЦВК інфармацыі

аб выніках галасавання па ўсіх выбарчых акругах з указаннем вынікаў галасавання па кожным выбарчым участку.

**Назіранне за выбарамі**

З мэтай узмацнення даверу да выбараў у Беларусі неабходна заканадаўча пашырыць іх транспарэнтнасць і правы назіральнікаў. Назіральнікі павінны мець магчымасць бесперашкодна знаёміцца з матэрыяламі камісіі, якія датычацца яе складу, шляхоў вылучэння ў яе сябраў, спісаў выбарцаў, захавання выбарчых бюлетэняў і скрынь падчас датэрміновага галасавання, а таксама рабіць фота і відэазапіс падчас назірання за выбарамі.